У працы, у марах, у песнях
Ён з намі ідзе праз гады—
Усіх пакаленняў равеснік,
Ільіч, як і мы, малады.

Уладзімір Ільіч ЛЕНІН

Блізкі, незабыўны, дарагі!

Сёння ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначае 91 год з дня нараджэння Ул. І. Леніна—заснавальніка Камуністычнай партыі, стваральніка савецкай дзяржавы, правадыра і настаўніка працоўных усіх краін.

Аб Уладзіміру Ільічу Леніну напісана шмат успамінаў, кожнае з якіх адлюстроўвае тую ці іншую яго рысу. Асабліва дарагі нам успаміны сучаснікаў, родных і блізкіх Ільіча. Якім рознастароннім, шматгранным, поўнакроўным паўстае перад намі вобраз вялікага Леніна, яго творчы характар ва ўспамінах О. І. Ульянавай, Крупскай, Фоцієвай, Луначарскага, Горкага!

◆

Уладзімір Ільіч добра ведаў лацінскую і грэчаскую мову...

Чытаў па нямецкай, французскай, англійскай, італьянскай мове, па польскай, чэшскай (не вельмі многа чытаў, але што-нішто чытаў), шведскай (газеты).

Французскую і англійскую мову (таксама нямецкую) вывучаў даволі дэталёва, граматыку, структуру, чытаў Ларуса і другія слоўнікі. На французскай мове ў нас быў зборнік пагаворак.

Уважліва чытаў Ул . І. Леніи слоўнік Даля, патрабаваў яго перавыдання (асобная камісія працавала, але не давяла справы да канца...)».

Н. К. КРУПСКАЯ.

* * *

Прыходзячы ў свой кабінет раніцай, Уладзімір Ільіч выслухваў кароткія паведамленні сакратара аб тэрміновых цякучых справах і аб выкананні зробленых ім напярэдадні загадаў, праглядваў пісьмы і паперы і рабіў па іх распараджэнні, вёў размовы па тэлефоне, прыймаў наведвальнікаў, даваў мноства даручэнняў сакратару і ўпраўсправамі па пытанням, узнікшым ў яго пры гутарках ці праглядзе папер, знаёміўся з павесткай і матэрыяламі к чарговаму паседжанню.

Л. А. ФОЦІЕВА.

* * *

У Леніна вялізны і як быццам асветлены знутры лоб, незвычайны, зоркі, праніклівы, а іншы раз і хітры погляд, цвёрды і ўладарліва акрэслены рот. У яго твары ёсць нейкая ільвіная масіўнасць. Твар яго вельмі рухомы. На ім ўвесь час чаргуецца выраз хітраватасці, увагі, здзіўлення, іроніі, глыбокай задумлівасці...

А. В. ЛУНАЧАРСКІ.

У ЛЕНІНСКІЯ ДНІ

Нядаўна выкладчыкі гістарычнага факультэта Мельцар, Чарнушчанка, дацэнты Ф. М. Нячай, М. Б. Фрыдман, прафесар Н. П. Палеціка выступілі перад студэнтамі з гутаркамі і лекцыямі, прысвечанымі Уладзіміру Ільічу Леніну. Пазней студэнты прагледзелі рад фільмаў, прысвечаных Леніну, і пазнаёміліся ў час ленінскіх дзён з месцамі мінскага камсамольскага падполля.

Кабінет гісторыі КПСС сумесна з кафедрай арганізаваў фотамантаж «Ул. І. Ленін (1870—1961 гг.)». Тут можна пазнаёміцца з дзіцячымі, юнацкімі гадамі Леніна. Правадыр на Чырвонай плошчы, на заводзе, выступае перад рабочымі, чырвонаармейцамі і г. д.

У кабінеце таксама маецца альбом «Жыццё і дзейнасць Ул. І. Леніна», рэкамендацыйныя спісы літаратуры, стэнд: «Як працаваць над вывучэннем марксісцка-ленінскай літаратуры», вітрына «Марксізм-ленінізм—праграма камуністаў усяго свету».

П. З. САВАЧКІН,
дэкан гістарычнага факультэта.
А. МАЛЧАНАЎ,
лабарант.

АБ ЛЕНІНЕ

У корпусе гуманітарных навук сіламі бібліятэкі арганізаваны кніжная вітрына і кніжная выстаўка, прысвечаныя Леніну. Сярод кніг — творы Леніна.

Тут таксама брашуры, кнігі аб Леніне, прамовы тав. Хрушчова.

Д. РУДАКОЎСКАЯ,
бібліятэкар.

* * *

«Валодзю я бачыла трэцяга дня—была ў яго. Пакой, які ён заняў, мне падабаецца... ціха,—так што яму зручна будзе займацца... Прашэнне да экзаменаў яго было прынята...спадзяваецца, што паспее падрыхтавацца...».

«Ён ужо здаў два прадметы і па абодвух атрымаў «5».

О. І. УЛЬЯНАВА.

* * *

Не магу ўявіць сабе такога чалавека, які, знаходзячыся так высока над людзьмі, умеў бы захаваць сябе ад спакусы да славы і не згубіў бы жывой цікавасці да «простых людзей». Быў у ім нейкі магнетызм, які прыцягваў да яго сэрцы і сімпатыі людзей працы. Мяне здзіўляла яго нечалавечая працаздольнасць.

М. ГОРКІ.

Тут працаваў Ільіч.

Універсітэт носіць імя Уладзіміра Ільіча Леніна

Наш універсітэт носіць імя вялікага правадыра ўсяго перадавога чалавецтва, заснавальніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы.

Хутка споўніцца 40 год, як існуе універсітэт.

Нядаўна гістарычны музей універсітэта арганізаваў фататэку, дзе ўжо маецца шэраг цэнных дакументаў, фота з гісторыі ўніверсітэта.

Гістарычны музей, усе грамадскія арганізацыі звяртаюцца да выкладчыкаў, студэнтаў, выпускнікоў, якія маюць якія-небудзь фота, білеты, граматы, падарункі, дыпломы і іншыя каштоўныя дакументы, якія расказваюць аб прошлым універсітэта, здаць іх у гістарычны музей, або ў камітэт камсамола, партком. Гэтыя рэліквіі, якія могуць расказаць аб самых разнастайных галінах універсітэцкай дзейнасці (вучобе, самадзейнасці, падшэфнай рабоце, сустрэчах з грамадскімі дзеячамі, пісьменнікамі і г. д.) прадстаўляюць для музея і для ўніверсітэта вялікую каштоўнасць.

Ф. АДАШЧЫК,
супрацоўнік музея.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 13(444) Субота, 22 красавіка 1961 г. Цана 1 кап.

ГЭТА СТВАРЫЎ ГЕНІЙ САВЕЦКАГА ЧАЛАВЕКА

Днямі наш карэспандэнт узяў інтэрв'ю ў прафесара, доктара матэматычных навук Дзмітрыя Аляксеевіча Супруненкі.

Гаворачы аб бяспрыкладнай мужнасці выдатнага лётчыка нашага часу Юрыя Аляксеевіча Гагарына, Д. А. Супруненка спыняецца на вялікай стваральнай працы вучоных, інжынераў, тэхнікаў, рабочых і на тым новым, што прынёс з сабою запуск касмічнага карабля. Усе папярэднія спадарожнікі і ракеты, хаця і вярталіся на зямлю, але да паўторнага палёту былі непрыгодны. Карабель жа, на якім лятаў Гагарын, можа быць яшчэ паспяхова выкарыстаны. Новым з'яўляецца і тое, што пілот-касманаўт мог назіраць акружаючую касмічную прастору, не падвяргаючыся ўздзеянню касмічных выпраменьванняў.

Многія цікавяцца, чаму ЗША зачастую церпяць няўдачы ў запуску спадарожнікаў. Справа тут у тым, што ЗША не дасягнулі яшчэ таго ўзроўню тэхнічнага прагрэсу, развіцця дынамікі вялікіх хуткасцей і паскарэнняў, якіх дасягнуў СССР. Наша краіна ідзе ўперадзе ЗША па ракетабудаванню, па дакладнасці прыбораў, якія выкарыстоўваюцца ў спадарожніках, ракетах, касмічных караблях. Палёты ў космас, вядома, будуць праводзіцца і ў далейшым. Недалёка той час, калі чалавек паляціць на Месяц, Марс і Вянеру. Будзем спадзявацца, што першым і тут будзе савецкі чалавек.

У гэтыя дні, калі ўся наша краіна святкуе першую перамогу чалавека над Космасам, да нас у рэдакцыю часта заходзяць студэнты, выкладчыкі. Яны дзеляцца сваімі ўражаннямі, думкамі. І не толькі заходзяць, а і прысылаюць водгукі, вершы. Сёння мы друкуем верш студэнта-завочніка Б. Асташонка «Андромеда».

АНДРОМЕДА

В звёздном голубом просторе
Андромеда светится вдали,
Как пылинка в воздухе, как в море
Островок незначащей земли.
Вихри, смерчи газов раскалённых
В космосе бушуют миллионы лет.
Андромеда—островок Вселенной:
Ночью виден только слабый свет.
Миллиарды лет она сияет,
Свет ее не гасит высота.
Андромеда манит, призывает
Разум человека, как мечта.
Как игла, фотонная ракета
Глубину пространства рассечёт,
Весть о жизни на Земле-планете
На соседний «остров» занесёт.
Пролетает время, словно птица,
Мы идём уверенно вперёд.
К Андромеде скоро устремится
С космодрома первый звездолёт.

ЗАЎТРА—ДА ПЛАНЕТ

Зусім нядаўна гэта было толькі думкай аўтараў навукова-фантастычных раманаў. Прачытаўшы такую кнігу, станавілася неяк крыўдна, што гэта толькі прыгожая і можа нездайсняльная мара чалавека. Цяпер жа, дзякуючы велізарнай працы нашых вучоных, чалавецтва, якое заўсёды было «прывязана» да зямлі, адкрыт шлях у Сусвет. І першым чалавекам, пабываўшым у Космасе, з'явіўся савецкі грамадзянін, наш равеснік Юрый Аляксеевіч Гагарын.

А. ТРУКШЫНА,
студэнтка I курса філфака.

Ганьба агрэсарам!

МІТЫНГІ ПРАТЭСТУ

19 красавіка ў аўдыторыі № 58 біякорпуса адбыўся вялікі мітынг пратэсту студэнтаў і выкладчыкаў БДУ супраць узброенага нападзення інтэрвентаў на гераічную Кубу.

Мітынг аднадушна прыняў рэзалюцыю, у якой патрабуе неадкладнага спынення агрэсіі супраць маладой рэспублікі.

У гэты дзень адбыўся мітынг студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ ў корпусе гуманітарных навук. Прысутныя паслалі тэлеграму кубінскаму пасольству ў Маскве. «Вы не адны,—гаворыцца ў тэлеграме,—з вамі ўвесь савецкі народ!».

* * *

20 КРАСАВІКА РАДЫЁ ПРЫНЕСЛА РАДАСНУЮ ВЕСТКУ: СІЛЫ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ АРМІІ НАНЕСЛІ САКРУШАЛЬНЫ РАЗГРОМ НАЁМНЫМ ВОЙСКАМ АМЕРЫКАНСКАГА ІМПЕРЫЯЛІЗМА.

УВЕСЬ КАЛЕКТЫЎ УНІВЕРСІТЭТА ГАРАЧА ВІНШУЕ КУБІНСКІ НАРОД З ГЭТАЙ СЛАЎНАЙ ПЕРАМОГАЙ.

СВОБОДУ КУБЕ!

Гавана дрогнула,
Как сердце пред тревогою.
В руках кубинцев
Зажато оружие праведное.
Куба идёт
Своей широкой дорогою.
Её не свернешь
К тёмной жизни прадедов.
Что вам надо,
Янки и карданы?
«Опыт Гватемалы»
Теперь повторить не придётся.
Народам Кубы
Пути другие заданы.
Чёрное дело
Вместе с вами сметется.
Народы мира!
Кубинцу руку подайте!
В его сражении
Частица и наших битв.
Банды предателей,
Вы, наверное, знаете,
Чем всё окончится,
Кто победит!
Свободу Кубе!—
Эхо над миром проносится.
Не мешайте кубинцу
Растить свой сахар белый!
Бандиты, помните,
Историей с вас спросится,
Сколько плохого,
Сколько чёрного вы сделали.

І. КУЗЬМІН,
студэнт 1-га курса аддз. журналістыкі.

ЭКЗАМЕНЫ НЕ ЗА ГАРАМІ

☆ ☆

Беражыце час

Мне здаецца, што асновай выдатнай вучобы з'яўляецца здольнасць правільна размеркаваць час. Многа спраў заўсёды ў студэнта. І толькі пры правільнай арганізацыі працы, разумным чаргаванні заняткаў можна заўсёды паспець усё зрабіць.

З першага курса ў мяне ўвайшло ў звычку штодзённа займацца ў чытальнай зале. Узяўшыся за кнігі, стараюся заўсёды працаваць як мага прадуктыўней, поўнасцю ўнікаць у вывучаемы матэрыял, забываць аб усім пабочным. Пры такой арганізацыі працы часу на падрыхтоўку да заняткаў траціцца не больш чатырох гадзін. Застаецца час і для грамадскай работы, і для спорту, і для іншых спраў. Калі сістэматычна працуеш на працягу года, то ў час сесіі не прыходзіцца ператамляцца, знаходзіцца час і для кіно і для адпачынку.

Трэба імкнуцца да таго, каб увечары, падводзячы вынікі дня, заўсёды можна было сказаць: дзень пражыты недарэмна, за гэты дзень удалося шмат чаго даведацца, многае зрабіць. Маральна гэта заўсёды прыносіць вялікае задавальненне.

М. БАРКОЎСКАЯ,
студэнтка 5-га курса хімфака.

Дзве гадзіны працы

Мы на семінары па палітычнай эканоміі ў першакурснікаў юрыдычнага факультэта. Як ні дзіўна, але тут з'ява даволі-такі непрывычная для студэнцкага вока: прысутнічаюць усе. Відаць, адчуваецца набліжэнне сесіі.

Выкладчык Пётр Усцінавіч Грышановіч задае першае пытанне, але «народ безмолствует». Ціха ў аўдыторыі, студэнты напружана чытаюць запісы ў канспектах, на тварах замаскіравана затоеная надзея: «хаця б не мяне». Нарэшце, пасля бясконцых хвілін чакання, пад агульны ўздых палёгкі, узнімаецца студэнт Закрэўскі. Пытанне асвечана даволі добра, некалькі дробных паправак з боку выкладчыка, і пачынаецца разбор другога пытання «Аб узнікненні манаполій». Тут таксама, нягледзячы на гарачыя заклікі выкладчыка, лес рук не ўзняўся, і прыйшлося т. Грышановічу выклікаць студэнта Вараб'я. Спачатку адказ ішоў зусім гладка, нездарма ў людзей час-ад-часу мільгаюць шчаслівыя здагадкі, ды і канспекты нярэдка дапамагаюць.

Пасля перапынку «актыўнасць» узрастае: ці то прайшоў раніш-ні сон, ці можа матэрыял стаў больш цікавым, але студэнты адказваць просяцца самі, хаця і тут не абыходзіцца без падручнікаў.

Добра адказвалі Маргуноў, Міранічэнка, Закрэўскі. Трэба адзначыць умелае правядзенне семінара выкладчыкам П. У. Грышановічам. Ён неўзаметку дае наводзячыя пытанні, асцярожна выпраўляе памылкі (нават стылістычныя) і, што вельмі цікава, што на пытанні адказвае той, хто асвятляе галоўную тэму лепей. Калі што не так—дапамагае другі, трэці, а ў цяжкім выпадку прыходзіць на выручку выкладчык. Ісціна, нарэшце выяўляецца.

Увогуле заняткі прайшлі нядрэнна, асабліва пад канец, бо ўжо не страшна—званок блізка. Вось, нарэшце, і ён! Знікае напружанасць, знікаюць кнігі і канспекты. Бывай, палітэканомія, да наступнага разу!

Т. АЛЯКСАНДРАВА.

Прысвечаная Ленінскім дням

19—20—21 красавіка на ўсіх факультэтах універсітэта праводзіцца традыцыйная XVIII студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная Леніну. У праграме канферэнцыі былі даклады і гутаркі, навуковыя работы.

Работа канферэнцыі праходзіла па секцыях: гістарычных, юрыдычных, матэматычных навук, беларускай і рускай мовы, беларускай, рускай і зарубежнай літаратур і журналістыкі і г. д.

У канцы адбылося абмеркаванне дакладаў і выступленні кіраўнікоў секцый.

Сесія пачалася

Студэнты чацвертага курса хімічнага факультэта, якія хутка выязджаюць на практыку, ужо здалі рад залікаў.

Добра пачалі сесію чацвертакурснікі! Паспяхова здаўшы залікі, яны нядрэнна падрыхтаваліся і да экзаменаў.

20 красавіка група хімікаў здавала экзамен прафесару Мікалаю Фёдаравічу Ермаленку.

«Выдатна» атрымалі М. Пупкевіч, В. Зайцава, «добра»—Л. Жарноўская, Т. Петлякова, Н. Паўлючэнка.

Л. АСТРОЎСКАЯ,
студэнтка 4-га курса хімфака.



Хутка экзамены. В. Палхоўскі і Л. Ражба (IV курс біяфака) падрыхтоўваюць матэрыялы для санітарна-бактэрыялагічнага аналіза вады.

М. К. ШЫДЛОЎСКІ

10 красавіка пасля цяжкай і доўгай хваробы памёр загадчык кафедры электрафізікі БДУ імя У. І. Леніна, дацэнт, кандыдат фізіка-матэматычных навук Міхаіл Конанавіч Шыдлоўскі.

М. К. Шыдлоўскі нарадзіўся 5 чэрвеня 1903 года ў беднай сялянскай сям'і. Закончыўшы савецкую адзінаю працоўную школу 2-й ступені, М. К. Шыдлоўскі паступае ў 1923 годзе на фізіка-матэматычнае аддзяленне педагагічнага факультэта БДУ. Ён працуе істапніком лабараторый, а затым лабарантам і механікам кафедры. Пасля заканчэння БДУ ў 1928 годзе М. К. Шыдлоўскі выкладае ў горадзе Жлобіне, а з 1930 года пачынае навукова-педагагічную дзейнасць у Мінску.

У 1933 годзе М. К. Шыдлоўскі пераходзіць на пасаду асістэнта кафедры эксперыментальнай фізікі БДУ.

М. К. Шыдлоўскі—удзельнік вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь, ваяваў з белафінамі, а з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны—ён на пярэднім краі.

М. К. Шыдлоўскі ўзнагароджаны ардэнамі і медалямі СССР.

З 1945 года—М. К. Шыдлоўскі зноў ва ўніверсітэце. Ён вядзе вялікую педагагічную, навукова-даследчую работу на кафедры электрафізікі. Яго імя носіць адзін з новых навуковых метадаў па даследаванню дзеяння моцных палёў на паўправаднікі і дыэлектрыкі.

Кандыдат фізіка-матэматычных навук Міхаіл Конанавіч Шыдлоўскі неаднаразова выбіраўся членам і старшынёй мясцкома, у рэвізійную камісію і г. д.

Са смерцю М. К. Шыдлоўскага калектыў навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў БДУ страціў высокакваліфікаванага фізіка-эксперыментатара, умелага арганізатара, вопытнага выкладчыка.

Памяць аб ім назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.

„ЗБЯРЫЦЕ 25 РУБЛЁЎ..."

«Сягоння вечар адпачынку»—паведамляе афіша.—Іграе аркестр». Студэнты, як толькі сцямнее, спяшаюцца на вечар. Вечар адпачынку прайшоў цікава, але..

На гэтым «але» трэба спыніцца. У корпусе гуманітарных факультэтаў для танцаў выкарыстоўваецца фізкультурная зала. Дазвол на яе павінен даваць кожны раз рэктар універсітэта. Безумоўна, выпрасіць залу для танцаў нялёгка, аднак усё ж удаецца гэта заўсёды. Але аказваецца, што важнейшай праблемай для студэнтаў з'яўляецца не зала.

У нас ва ўніверсітэце на грамадскіх пачатках створаны эстрадны аркестр. У састаў аркестра ўваходзяць студэнты амаль усіх факультэтаў, увогуле, усе свае хлопцы. Аднак, кожны раз на вечары ўсе аркестранты разам са старастай заяўляюць: «Заплаціце 25 рублёў, будзем іграць». Без танцаў, вядома, не можа быць сапраўднага вечара адпачынку. Сабралі, напрыклад, 22 рублі 40 капеек. У аркестрантаў ужо зусім не той настрой, і згаджаюцца яны пайграць пасля тлумачэння ім, што больш сабраць было немагчыма.

Таварышы аркестранты! А ці не дзіўна вам было б пачуць, што скажам, за выступленне ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці—трэба плаціць 20 капеек? Вашы прэтэнзіі на аплату нічым не адрозніваюцца ад гэтага. Вы лічыце сябе людзьмі сумленнымі, справядлівымі. Але ці так гэта?

Вельмі крыўдна і балюча ўсведамляць, што ў нашай дружнай студэнцкай сям'і ёсць людзі са сваімі вузкімі эгаістычнымі поглядамі. Яны імкнуцца зарабіць «капейку» нават ад свайго брата-студэнта. Чым яны адрозніваюцца ад тых прыватных асоб, якія чхнуць не могуць без грашовай таксы і аплаты.

У нас ва ўніверсітэце агульнаўніверсітэцкія і факультэцкія вечары праводзяцца рэдка. Гэта адбываецца часткова з-за таго, што няма ў нас свайго, у поўным сэнсе слова, такога аркестра, які бясплатна іграў бы на нашых вечарах. А было б добра ўстанавіць якійсьці парадак чаргавання ігры аркестра на кожным факультэце. Сродкі, збіраемыя зараз студэнтамі на аплату аркестра, маглі б быць выкарыстаны на розныя гульні, атракцыёны. Вечары пры бясплатным аркестры можна было б рабіць часта, а не толькі ў святочныя дні.

Хацелася б, каб наш прафком і камітэт камсамола сур'ёзна заняліся эстрадным аркестрам.

Удзел ў аркестры павінен лічыцца такой жа грамадскай нагрузкай, як і ўдзел студэнтаў у мастацкай самадзейнасці, у спартыўных секцыях і г. д.

Л. СЯНЮТА.

Шукаць, тварыць, знаходзіць...

ПІСЬМО 2-е

◆

...Пад вечар шукаю спадарожную машыну на Салігорск. Уяўляю: разгорне які-небудзь чытач свежы нумар газеты і прачытае, што там робіцца вечарам на агітпункце ў Салігорску. А можа і не прачытае. Проста зірне на загаловак і ўсё... А я павінен ехаць, напісаць. І добра напісаць. Магчыма, мой матэрыял дапаможа ў рабоце якому-небудзь іншаму агітпункту. Усяляк жа бывае. Так, я павінен ехаць.

Агітпункта ў Салігорску я не знайшоў. Пабываў не ў адным месцы, якія звычайна адводзяць пад агітпункты, нават акуляры адзеў, каб не прамаргаць. У клубе будаўнікоў даведаўся, што агітпункт яшчэ не афармілі. Вось-вось будзе, а покуль-што няма. Ехаў назад у Старобін ні з чым. І дарэмна грошы патраціў, і мёрз на прыпынках, і дарэмна біў ногі. Але горачы не было: я ўжо цвёрда ведаў, каб напісаць нават маленькую інфармацыю, іншы раз трэба патраціць увесь дзень і шмат энергіі пры тым...

Засеў за пісьмы... Наогул іх няцяжка апрацоўваць. Але адчувалася, што не хапае слоўнікавага запасу. Шкадаваў, што мала чытаў у апошні час твораў беларускіх класікаў. У крыўдзе быў і на ўніверсітэт: чаму б не ўвясці ў праграму курс беларускай літаратуры ў першыя гады навучання?...

На трэці дзень спазніўся на тры хвіліны на работу. Усе ўжо былі ў рэдакцыі, і мне стала нявёмка. Горш за ўсё было тое, што мне не было чаго рабіць: пісьмы скончыліся, а пошта яшчэ не прыйшла. Барташэвіч штосьці пісаў, Круглік таксама пісаў, цёця Ліза энергічна стукала на машынцы...Я ж не ведаў, за што ўзяцца. Надзвычай няёмка сядзець склаўшы рукі, калі вакол цябе людзі працуюць. Адчуваеш сябе ў нечым вінаватым, быццам зрабіў нешта непрыгожае, крыўднае для акружаючых. Тады мне першы раз за тры дні, праведзеныя ў рэдакцыі, стала сумна. Здалося, што я тут зусім непатрэбны.

Узяў я чысты ліст паперы, стаў стэнаграфічна пісаць, успамінаючы мудрагелістыя кручочкі.

—О! Ты стэнаграфію ведаеш?—здзівіўся Барташэвіч, выпадкова паглядзеўшы, што я там раблю.

—М-м... праходзілі,—нясмела адказаў я.—Праўда, даўно.

—Збегай хуценька ў школу, там ўчора спаборніцтвы былі. Па лыжах.

Радасны, я пабег, усё разведаў. І напісаў.

У хуткім часе трапіў я ў кантору калгаса «Заветы Ільіча». Пацікавіўся старой насенгазетай. Старшыня калгаса, які якраз быў там, паказаў абавязацельствы, планы, схемы, дошку гонару... Словам, усяляк імкнуўся адцягнуць мяне ад газеты.

Зацікавіла ж мяне другое: звычайная шафа, ёмістая, добра зробленая.

Гэта быў свайго роду кніжны кіёск, толькі без прадаўца. У сярэдзіне шафы—палічкі і скрынчка для грошай. Але кніг у сярэдзіне не было: раскупілі. Я правёў пальцам па палічцы—пыльна. Відаць, даўно пустуе. І стаіць шафа ў кутку калідора, падобна на канцылярскую і ўвагі не прыцягвае.

Назаўтра пабег у райспажыўсаюз. Даведаўся, што кніжныя шафы ў многіх населеных пунктах раёна, але там-сям яны пустуюць. Я і напісаў заметку: «Добрай справе—падтрымку». Яна таксама атрымала цёплы водгук.

Агледзеўшыся добра, я стаў пісаць многа і часта. З аддзелаў пасыпаліся заданні. Бываў я ў арганізацыях і на прадпрыемствах райцэнтра. Ездзіў па вёсках, бываў на фермах, у клубах, сустракаўся, гаварыў з мноствам людзей. Прападаў на некалькі дзён, губляў галошы ў дарожнай гразі, дрог на холадзе, еў, дзе прыдзецца і як прыдзецца. Вяртаўся ў рэдакцыю і пісаў, узрушаны, насычаны ўражаннямі. Кіраўнік закрэсліваў, папраўляў, павучаў, і ...аддаваў матэрыял перапісваць занава... Перапісваў! Адзін, другі, а трэба і трэці раз... Новік прыгаварваў: «Э, нічога! Табе ж на карысць пойдзе». Матэрыялы мае ідуць цяпер у кожным нумары. І, галоўнае, я зараз не адчуваю сябе адзіноkім, закінутым, а упэўнена магу сказаць, што я цяпер—не госць. Магчыма, і ад мяне, практыканта, ёсць карысць, хай сабе і невялікая. Калі так—я задаволены.

І. ПАТАПАЎ,
студэнт III-га курса аддзялення журналістыкі.

г. Старобін.

Нехапае майстэрства

СПОРТ

Ужо некалькі дзён працягваюцца спаборніцтвы баскетбалістаў. Першую перамогу атрымала каманда філфака над хімікамі. Матфакаўцы перамаглі географаў з лікам 61:45, а ў сустрэчы гісторыкаў з юрыстамі мацнейшымі аказаліся гісторыкі.

Добры старт ўзялі прадстаўніцы гістарычнага факультэта. Яны маюць дзве перамогі. Дзяўчаты матэматычнага факультэта абыгралі географаў (44:42) і біёлагаў (31:23).

Хочацца зрабіць некалькі агульных заўваг, асабліва дзяўчатам. Мала, вельмі мала тактыкі, майстэрства і вельмі многа сілавой барацьбы за мяч. А ў баскетболе перамагае толькі той, хто акрамя фізічнай сілы, умее камбінаваць. Многія каманды, у тым ліку і гісторыкі, і географы, гуляюць толькі на аднаго чалавека. У гісторыкаў гэта Г. Андрэйчык, у хімікаў гэтую ролю спрабавала выконваць пакуль што няўдала, чэмпіёнка ўніверсітэта па скачках у вышыню Г. Саўчанка. А дзе кваліфікаваныя баскетбалісты? Іх няма, нават сярод членаў зборнай, якія выступаюць за факультэты. Мы не супраць многастароннасці спартсмена, але мы і за спартыўнае майстэрства. У сустрэчах паглядаецца надзвычай малы працэнт штрафных пападанняў, мала «узятых» карзін з гульні.

С. ГОВІН.
Наш. кар.

ШАШКІ

У нядаўна закончыўшыхся асабістых спаборніцтвах БДУ па шашках выявіліся пераможцы. Гэта Я. Кухарчук (студэнт першага курса матфака), А. Абрамовіч (матфак), Кацаў (фізфак). Яны выканалі норму I разраду.

На першынстве г. Мінска сярод студэнтаў у сустрэчах з мацнейшымі шашыстамі прадстаўнікі ўніверсітэта нярэдка выходзілі пераможцамі. С. Розін (матфак), які заняў другое месца, і Н. Лепяшынскі выканалі норму першага разраду.

Рэктарат, партыйны камітэт, мясцком і кафедра гісторыі КПСС Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыку кафедры гісторыі КПСС В. А. РАБЦЭВІЧУ з прычыны напаткаўшага яго гора—смерці БАЦЬКІ.

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

НАШ АДРАС:
Мінск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус, 31.
Тэлефон: 2-07-19.
Друкарня выдавецтва
БДУ імя У. І. Леніна.

АТ 04319. Зак 1044.